

*К.Крапіва.*

пісьменнік Беларусі (1956). Акадэмік НАН Беларусі (1950). Д-р філал. навук (1953). Герой Сац. Працы (1975). Засл. дзеяч навукі Беларусі (1978). Скончыў БДУ (1930). Настаўнічаў на Міншчыне, у 1925—26 інструктар Цэнтр. бюро краязнаўства пры Інбелкульце. З пач. Вял. Айч. вайны ў ваен. друку, з 1943 адказны рэд. сатыр. газ.-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну». З 1945 рэд. час. «Вожык». З 1947 у Ін-це л-ры і мовы АН Беларусі (заг. мовазнаўчага сектара). З 1952 дырэктар Ін-та мовазнаўства АН Беларусі. З 1956 віцэ-прэзідэнт АН Беларусі. У 1982—89 у Ін-це мовазнаўства АН Беларусі. Сатыр. творы К. адрозніваюцца нац. самабытнасцю, актуальнасцю, вострым гумарам. Яны высмейваюць і выкрываюць распаўсюджаныя забабоны, быт. бескультур'е, плёткі, п'янства, шарлатанства, ганарлівых невукаў, злодзеяў і падхалімаў. Яскравасць, афарыстычнасць аўтарскага слова асабліва прыкметныя ў байках, якія сталі ўзорамі гэтага жанру ў бел. л-ры («Махальнік Іваноў», «Ганарысты Парсюк», «Дыпламаваны Баран»). У рамане «Мядзведзічы» (1932, няскончаны) рэалістычна паказана дакалгасная вёска. З 1933 гал. жанрам К. стала драматургія: п'еса «Канец дружбы» (паст. 1934), гераічная драма аб Грамадз. вайне «Партызаны» (паст. 1937), псіхал. драмы, прысвечаныя Вял. Айч. вайне — «Проба агнём», «З народам» (абедзве паст. 1948), «Людзі і д'яблы» (паст. 1958), лірычная камедыя аб пасляваен. сялянскім жыцці «Пяюць жаваранкі» (паст. 1950, аднайменны фільм па сцэнарыю К.), драма «На вастрыі» (паст. пад назвай «Блытаныя сцежкі», 1983) апавядае аб жыцці медыкаў у мірны час. Камедыя «Хто смяецца апошнім» (паст. 1939, аднайм. фільм па сцэнарыі К. 1954) — выдатны прыклад сатыр. л-ры. У ёй з вял. майстэрствам адлюстраваны ваяўнічая псеўдавучонасць, кар'ерызм, практыка даносаў, падаўленне асобы непісьменным начальствам. Сатыр. камедыя «Мілы чалавек» (паст. 1945) асуджае і высмейвае карупцыю, людзей-прыстасаванцаў. Прац. тэме прысвечана п'еса «Зацікаўленая асоба» (паст. 1953). Фантаст. камедыя з глыбокай філас. праблематыкай «Брама неўміручасці» (паст. 1974,) — спроба аўтара пранікнуць у сутнасць чалавечага жыцця, спасцігнуць прыроду смерці, супярэчнасці навук. прагрэсу, праблемы экалогіі. К. з'яўляўся рэд. «Дыялектычнага атласа беларускай мовы» (1963), «Руска-беларускага слоўніка» (т. 1—3, 10-е выд., 2012), «Беларуска-рускага слоўніка» (т. 1—3, 4-е выд., 2012) прымаў удзел у комплексе работ па лінгвагеаграфіі. Пераклаў асобныя творы І.Крылова, А.Астроўскага, Т.Шаўчэнкі, А.Міцкевіча. Дзярж. прэмія СССР 1941, 1951, 1971. Дзярж. прэмія Беларусі 1974.

*В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова